УДК 811.161.3:378.6

**В. В. Шахаб**
Беларускі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт

# АБ БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ Ў ТЭХНАЛАГІЧНАЙ АДУКАЦЫІ

Артыкул прысвечаны разгляду пытанняў рэалізацыі адукацыйнага і светапогляднага патэнцыялу беларускай мовы як дысцыпліны і як сродку фарміравання сацыяльна-асобасных, акадэмічных і прафесійных кампетэнцый сучасных студэнтаў устаноў вышэйшай адукацыі. Прадэманстраваны досвед, назапашаны Беларускім дзяржаўным тэхналагічным універсітэтам у дадзеным кірунку, паказаны выхаваўчыя магчымасці і запатрабаванасць беларускай мовы ў тэхналагічнай адукацыі сучаснай Беларусі. Падкрэсліваецца значэнне навучальнай дысцыпліны па дзелавой лексіцы беларускай мовы. Вылучаны 30 дысцыплін сацыяльна-гуманітарнага і адмысловага цыклаў, выкладанне якіх вядзецца на беларускай мове, па 29 з якіх маюцца электронныя канспекты лекцый, даступныя студэнтам праз бібліятэку, а таксама 350 розных выданняў БДТУ навучальна-метадычнага характару на беларускай мове. Коратка апісаны прадугледжаныя планам развіцця ўніверсітэта мерапрыемствы, накіраваныя на папулярызацыю і пашырэнне ўжывання мовы ў навучальным працэсе. Пашыраецца ўжыванне беларускай мовы ў студэнцкай практыцы ў тым ліку за кошт іх удзелу ў штогадовых конкурсах, якія праводзяцца ва ўніверсітэце, кружках студэнцкага навуковага аб'яднання «Пошук», «Памяць», «Мая Радзіма – Беларусь», «Спадчына», «Патрыёт», «Крыніца», а таксама ў літаратурным клубе «Ветліца», праекце «Жыву і памятаю».

**Ключавыя словы:** беларуская мова, тэхналагічная адукацыя, прафесійнае і асобаснае развіццё, каштоўнасныя маркеры, інтэлектуальны патэнцыял, гуманітарная культура, псіхалінгвістычнае ўздзеянне.

**O. V. Shahab**
Belarusian State Technological University

# ABOUT THE BELARUSIAN LANGUAGE IN TECHNOLOGICAL EDUCATION

The article is devoted to the issues of the realization of the educational and world outlook potential of the Belarusian language as a discipline and as a means of forming the social, personal, academic and professional competencies of modern students of higher education institutions. The experience accumulated by the Belarusian State Technological University in this direction, opportunities and relevance of the Belarusian language in the technological education of modern Belarus has been spent. It is outlined the value of the course on business Belarusian. 30 courses of humanitarian and economic circles that are delivered in Belarusian are named. 29 among them are supplied with electron conspectus of lectures. As well there 350 published materials in BSTU in Belarusian for students. In short, the plan of the development of Belarusian language use in university practice is analyzed. The goals of the plan are to be achieved by participation of the students in annual completions, which are organized for students, coteries like “Search”, “Memory”, “Belarus is my Motheland”, “Heritage”, “Patriot”, “Spring”, and in literature club “Vetlitsa”.

**Key words:** Belarusian language, technological education, professional and personal development, value markers, intellectual potential, humanitarian culture, psycholinguistic influence.

**Уводзіны.** Станаўленне нацыянальнай тэхналагічнай адукацыі для беларускага грамадства на сённяшні дзень з'яўляецца стратэгічна важнай мэтай. Забеспячэнне эканамічнай стабільнасці ў розных галінах вытворчасці цалкам залежыць ад якасці падрыхтоўкі спецыялістаў-прафесіяналаў, здольных мабільна рэагаваць на патрабаванні часу і апярэджваць іх. Кіраўніцтвам нашай краіны неаднаразова падкрэслівалася, што ідэалогія беларускай дзяржавы грунтуецца на любові да сваёй зямлі, павазе да людзей і гонары за сваю дзяржаву. Гэтыя пачуцці з'яўляюцца неад'емнымі складнікамі поспеху ў эканамічным развіцці краіны. У дадзеным кантэксце прафесійны поспех кожнай асобы магчымы толькі пры разуменні ёй самакаштоўнасці і каштоўнасці для роднай зямлі, свайго месца ў яе гістарычным развіцці. Надзвычай важна тое, што сучасны спецыяліст, якому трэба будзе працаваць у дынамічным прафесійным асяроддзі, павінен мець такі сацыяльны інтэлект і культурна-каштоўнасныя арыентацыі, якія дазволяць яму жыць у гармоніі з грамадствам і дзяржавай.

Вядома, што інтэлектуальны патэнцыял і асноўны інавацыйны прадукт нашага грамадства фарміруюцца і выкрышталізоўваюцца ў сферы вышэйшай адукацыі. Менавіта тут асоба ўсвядомлена вызначае траекторыю свайго ўласнага развіцця і набывае прафесійны практычны

і сацыяльны досвед, які ў далейшым не толькі спрыяе станаўленню спецыяліста, але і вызначае ўмовы паспяховай сацыялізацыі і нацыянальна-культурнай ідэнтыфікацыі. Таму сутнасць сучаснай вышэйшай адукацыі заключаецца ў падрыхтоўцы кваліфікаваных спецыялістаў з высокай прафесійнай і навуковай кампетэнтнасцю, агульнай культурай і светапоглядам.

**Беларуская мова як першаснова сацыяльна-каштоўнаснай арыентацыі асобы.** Маральна-духоўны складнік жыцця беларускага грамадства ў цэлым і кожнай яго асобы ў прыватнасці быў прыярытэтным для айчыннай сістэмы адукацыі фактычна на ўсім шляху яе развіцця і станаўлення. Не менш надзённым для нашай краіны бачыцца ён і сёння, калі ў плыні масавай глабалізацыі надзвычай важным усведамляецца захаванне нацыянальнага аблічча, нацыянальнай ідэнтычнасці, назапашванне айчыннага навуковага, культурнага і адукацыйнага патэнцыялу, развіццё і змястоўнае напаўненне сучаснай нацыянальнай ідэі. Айчынная педагагічная думка на працягу гісторыі яе развіцця прыйшла да слушнай высновы, што гармонія фізічных, інтэлектуальных і духоўных пачаткаў садзейнічае дасягненню індывідам маральных вяршынь. Бясспрэчны і той факт, што якасць адукацыі, якая не працуе на сацыяльна-маральнае аблічча будучага спецыяліста, выклікае сумненне з прычыны яе фактычнай небяспекі для грамадства і дзяржавы. На стваральную дзейнасць чалавека натхняе разуменне ўласнай адметнасці, ролі і месца ў нацыянальным інтэлектуальным развіцці, у адваротным выпадку чалавек пазбаўлены руху да творчых і працоўных здабыткаў.

Менавіта моўная адукацыя на сённяшні дзень усведамляецца тым стрыжнем, які кансалідуе грамадскасць і спрыяе рэалізацыі чалавека як асобы і як спецыяліста менавіта на сваёй радзіме, таму пытанне сістэмнага забеспячэння бесперапыннай моўнай адукацыі вырашаецца на розных адукацыйных узроўнях. Родная мова разглядаецца як аснова этнічнай памяці народа, сродак нацыянальна-культурнай ідэнтыфікацыі і сацыялізацыі асобы, вядучы фактар фарміравання патрыятызму і грамадзянскасці.

**Дзейнасць Беларускага дзяржаўнага тэхналагічнага ўніверсітэта па папулярызацыі беларускай мовы.** Праца па папулярызацыі і пашырэнні сферы ўжывання беларускай мовы ў жыцці грамадства праводзіцца па розных напрамках у цесным узаемадзеянні з іншымі ўстановамі вышэйшай адукацыі, навукова-даследчымі цэнтрамі, адукацыйнымі і культурна-асветніцкімі ўстановамі Рэспублікі Беларусь і сістэматычна асвятляецца ў рэспубліканскіх СМІ, на афіцыйным сайце БДТУ, старонках універсітэцкай газеты «Тэхнолаг». Факультэты ўніверсітэта максімальна выкарыстоўваюць беларускую мову ў справаводстве, інфармацыйным асяроддзі і штодзённай працы. Напрыклад, факультэт прынттэхналогій і медыякамунікацый ажыццяўляе справаводства (загады, распараджэнні, расклад і г. д.) і вядзенне вучэбна-ўліковай дакументацыі толькі на беларускай мове. Маецца беларускамоўная версія сайта БДТУ.

Выкладчыкі беларускай мовы БДТУ надзвычай вялікую ўвагу надаюць методыцы выкладання дысцыпліны «Беларуская мова (прафесійная лексіка)» і вычарпальнаму агульнакультурнаму кантэксту дысцыпліны. Яны зыходзяць з таго, што вучэбны працэс неабходна забяспечыць не толькі дыдактычнымі сродкамі ў адпаведнасці з патрабаваннямі праграмы, але і тэкставым матэрыялам (тэкстацэнтрычны падыход), суаднесеным з рэальнымі сферамі духоўнасці (этыкі, культуры, маралі), актуальным для развіцця сучаснага грамадства. Выкарыстоўваецца інфармацыйна насычаны, стылёва разгалінаваны, лексічна і сінтаксічна разнастайны тэкставы матэрыял, прапануецца шырокі спектр паслятэкставых заданняў (напісанне эсэ, нарысаў, публіцыстычных прамоў; дадатковыя паведамленні па прафесійнай і сацыяльна-культурнай тэматыцы; вывучэнне энцыклапедычнай і даведачнай літаратуры; самастойная пошукавая дзейнасць і інш.). Усё гэта стымулюе развіццё вуснага маўлення. Поруч з фарміраваннем уласна лінгвістычных ведаў пашыраецца кругагляд студэнтаў, назапашваецца іх інтэлектуальны патэнцыял, што ў цэлым дэтэрмінуе агульную духоўную культуру моладзі.

На сённяшні дзень у Беларускім дзяржаўным тэхналагічным універсітэце на беларускай мове выкладаецца трыццаць вучэбных дысцыплін, сярод якіх не толькі гуманітарныя, але і такія, як «Асновы вядзення лясной гаспадаркі і лесакарыстання», «Асновы інжынернай творчасці і інаватыка», «Асновы інавацыйнай дзейнасці», «Дэндралогія», «Засцярога металаў ад карозіі», «Лясная піралогія з асновамі радыёэкалогіі», «Матэрыялазнаўства і апрацоўка матэрыялаў», «Матэрыялазнаўства і тэхналогія канструкцыйных матэрыялаў», «Машыны і абсталяванне прадпрыемстваў будаўнічых матэрыялаў», «Тэарэтычная механіка», «Тэорыя аўтаматычнага кіравання», «Тэхналогія рэдакцыйна-выдавецкай справы», «Этнаграфічныя рэсурсы турызму» і інш.

Вышэйпералічаныя дысцыпліны забяспечаны адпаведнымі вучэбнымі дапаможнікамі на беларускай мове, цалкам або часткова створаны вучэбна-метадычныя комплексы (у тым ліку электронныя) па 29 вучэбных дысцыплінах I ступені вышэйшай адукацыі. На сённяшні дзень Беларускі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт валодае дастатковымі магчымасцямі для арганізацыі навучання на беларускай мове. Тыпавыя вучэбныя планы і вучэбныя планы па ўсіх спецыяльнасцях распрацаваны на беларускай мове. Па шэрагу дысцыплін падрыхтаваны адпаведныя вучэбныя выданні і дыдактыка-метадычнае забеспячэнне – звыш 530 найменняў па ўсіх спецыяльнасцях, створаных за апошнія 20 гадоў толькі супрацоўнікамі БДТУ.

Універсітэт паспяхова выконвае План мерапрыемстваў па папулярызацыі і пашырэнні сферы выкарыстання беларускай мовы ў жыцці грамадства на 2010 і наступныя гады. На сістэмнай аснове рыхтуюцца творчыя і сацыяльна-адукацыйныя праекты, праводзяцца алімпіяды па беларускай мове; арганізуюцца сустрэчы з пісьменнікамі, прадстаўнікамі навуковай і творчай інтэлігенцыі, студэнтамі наведваюцца ўсе знакавыя мерапрыемствы культурна-асветніцкага характару гарадскога і рэспубліканскага ўзроўняў. Такія ініцыятывы аб’ектыўна стымулююць цікавасць студэнцкай моладзі да актуальных праблем беларускай мовы, пытанняў гісторыі, літаратуры і культуры.

Звыш 40 артыкулаў – рубрыка «Роднае слоўка» – надрукавана ў газеце «Мінская праўда». Аўтар рубрыкі, загадчык кафедры рэдакцыйна-выдавецкіх тэхналогій Куліковіч У. І., стаў пераможцам VI Фестывалю нефармальнай адукацыі і ў 2017 г. узнагароджаны Граматай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь.

З мэтай захавання народных традыцый кафедрай турызму і прыродакарыстання штогод практыкуецца правядзенне абрадавых святаў («Каляды» і «Гуканне вясны»), у якіх актыўна прымаюць удзел студэнты БДТУ. У распрацаванай экалагічнай сцежцы «Казка Негарэльскага лесу» выкарыстоўваюцца персанажы беларускай міфалогіі і элементы традыцыйных рамёстваў беларусаў [1, 2].

Беларускамоўная творчасць навучэнцаў і выкладчыкаў універсітэта ўдасканальваецца ў межах дзейнасці студэнцкага аб’яднання «Пошук» і літаратурнага клуба «Ветліца». Ва ўніверсітэце выдаецца літаратурна-мастацкі альманах «AVE» (выйшла восем нумароў). Студэнты рэгулярна бяруць удзел у Рэспубліканскім конкурсе навуковых прац, Рэспубліканскім конкурсе літаратурнай творчасці студэнтаў вышэйшых навучальных устаноў «Аўтограф», штогадовых універсітэцкіх конкурсах і атрымліваюць прэстыжныя ўзнагароды. Усе навуковыя і творчыя работы і праекты выкананы на беларускай мове.

Аналіз вынікаў адукацыйнай працы ў БДТУ паказвае, што беларускамоўныя праекты генеруюць большую частку высакаякаснага патрыятычнага зместу. На рэгулярнай аснове працуюць гурткі лінгвакультуразнаўчай накіраванасці, якія ўваходзяць у студэнцкае навуковае аб’яднанне «Пошук» («Памяць», «Пазнай свой край», «Мая Радзіма – Беларусь», «Спадчына», «Патрыёт», «Крыніца», літаратурны клуб «Ветліца»). Напрыклад, на ўніверсітэцкі конкурс навукова-даследчых і творчых прац студэнтаў па грамадскіх і гуманітарных навуках штогод падаецца звыш 200 прац, выкананых на беларускай мове. У перыяд з 2015 па 2017 гады ўдастоены I катэгорыі 9 студэнцкіх прац, II – 33 працы, III – 27 прац.

З мэтай вяртання гістарычнай памяці аб Вялікай Айчыннай вайне быў распрацаваны пастаянна дзеючы праект «Жыву і помню» ў межах працы гуртка «Памяць» (кафедра беларускай філалогіі). Дзейнасцю гуртка ахоплены практычна ўсе студэнцкія групы. Матэрыялы неаднаразова прадстаўляліся на шматлікія рэспубліканскія выставы і конкурсы і атрымлівалі высокую ацэнку. Сярод апошніх перамог – Дыплом І ступені і грашовы прыз у намінацыі «Мае гераічныя продкі» на рэспубліканскім конкурсе «Памяць роду: мінулае вачыма сучаснікаў» (узнагароджаны студэнцкі гурток «Памяць» УА «Беларускі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт» (кіраўнік – Кузьміч В. А., дацэнт кафедры беларускай філалогіі, выдатнік адукацыі, заслужаны работнік адукацыі Беларусі; навуковы кансультант – дацэнт Шахаб В. В.). На конкурс былі прадстаўлены рукапісы дзвюх кніг, створаных студэнтамі БДТУ. Матэрыяльная ўзнагарода, атрыманая студэнтамі, была накіравана на будаўніцтва мемарыяльнага комплексу «Трасцянец». У разглядаемым кантэксце вышэйзгаданы праект – гэта феномен калектыўнай свядомасці цэлай нацыі, таму што аднаўленне гістарычнай памяці дае найбольшы плён, калі яно адбываецца праз прызму асабістых перажыванняў канкрэтных людзей, з якіх нанова складаецца карціна велізарнага подзвігу народа. На жаль, з часам пэўныя падзеі могуць наогул забывацца і нават пераацэньвацца. Пры гэтым страчваецца засцерагальная функцыя гістарычнай памяці, якая захоўвае тоеснасць народа. Сучасная моладзь часам неахвотна звяртаецца да трагічных старонак нашай мінуўшчыны і, горш за тое, ацэньвае іх у адрыве ад гістарычнага кантэксту як нешта абстрактнае. Асабістае перажыванне мінулага, наадварот, напаўняе моладзь глыбока патрыятычным зместам і выводзіць грамадзянска-патрыятычнае і прафесійнае выхаванне на вышэйшы ўзровень. Сямейная гісторыя – ключ да ажыўлення і ўмацавання дзяржаўнай ідэалогіі, гэта той фактар, які робіць гістарычныя ісціны зразумелымі кожнаму грамадзяніну і павышае адказнасць асобы перад дзяржавай ва ўсіх сферах жыццядзейнасці, у тым ліку ў прафесійнай. Студэнты ўсведамляюць месца кожнай сям'і і кожнай асобы ў супольным развіцці грамадства і разумеюць прычыны, мэты і наступствы сваёй дзейнасці. Беларуская мова пры гэтым выконвае функцыю ланцуга, які мацуе памяць і будзе трансляваць яе ўжо нашчадкам цяперашніх студэнтаў.

У БДТУ таксама назапашаны пазітыўны вопыт па арганізацыі маштабнага навучання беларускай мове выкладчыкаў і супрацоўнікаў установы. Так, у 1991–1995 гадах на базе ўніверсітэта функцыянаваў Універсітэт беларускай мовы, гісторыі і культуры, у межах дзейнасці якога былі арганізаваны лекторыі, практычныя заняткі для ўсіх зацікаўленых у павышэнні ўзроўню гуманітарных ведаў. Пасля заканчэння навучання слухачам было выдадзена адпаведнае пасведчанне. У выніку грунтоўнай моўнай падрыхтоўкі прафесарска-выкладчыцкага складу была створана вялікая колькасць беларускіх прафесійных слоўнікаў, вучэбнай і метадычнай літаратуры, выкладанне многіх дысцыплін ажыццяўлялася па-беларуску. Прафесарска-выкладчыцкі склад БДТУ валодае беларускай мовай у належнай ступені, і абсалютная большасць сённяшніх навукова-педагагічных кадраў можа выкладаць вучэбныя дысцыпліны, у тым ліку профільныя, па-беларуску.

**Заключэнне.** Запатрабаванне ў беларускай мове як у сродку выхавання і адукацыі – гэта натуральны вынік палітыкі нашай дзяржавы, накіраванай на ўзмацненне дзяржаўнасці, павышэнне этнакультурнай прыцягальнасці нашай краіны для замежных турыстаў. Нацыянальны элемент у выхаванні, заснаваны на вывучэнні мовы, набывае асаблівае значэнне сёння, калі ў грамадска-культурным жыцці попыт на нацыянальную мову ў адукацыі выйшаў на зусім іншы ўзровень і ператварае яе ў магутны фактар нацыянальнага будаўніцтва. Акрамя таго, беларускамоўная адукацыя па спецыяльнасці дапамагае кансалідаваць нацыянальную адукацыйную і прафесійную супольнасць, а таксама стрымлівае адток каштоўных навуковых кадраў у краіны бліжняга і далёкага замежжа. Такім чынам, попыт на беларускамоўную адукацыю ў першую чаргу абумоўлены аб'ектыўнымі патрабаваннямі беларускай

эканомікі і дзяржаўнасці. Рэальныя вынікі ўжывання беларускай мовы ў БДТУ, пацверджаныя высокімі ўзнагародамі і выдатнымі адукацыйна-выхаваўчымі і навуковымі дасягненнямі, сведчаць аб вартасці беларускай мовы ва ўсіх сферах адукацыйнага працэсу.

## Літаратура

1. Зданович Н. И., Каплич В. М., Шапорова Я. А. Концепция проектируемой экологической тропы «Сказка Негорельского леса» // Труды БГТУ. 2015. № 1 (174): Лесное хозяйство. С. 256–259.

2. Экологическая тропа «Сказка Негорельского леса» как объект образовательного туризма / Н. И. Зданович [и др.] // Труды БГТУ. 2017. Сер. 1, № 1 (192): Лесное хозяйство, природопользование и переработка возобновляемых ресурсов. С. 74–78.

## References

1. Zdanovich N. I., Kaplich V. M., Shaporova Y. A. The concept of the projected ecological path “The Tale of the Niegoreloye Forest”. *Trudy BGTU* [Proceedings of BSTU], 2015, no. 1 (174), Forestry, pp. 256–259 (In Russian).

2. Zdanovich N. I., Shaporova Y. A., Kaplich V. M., Bachur O. V. Ecological path “The Tale of the Niegoreloye Forest” as an object of educational tourism. *Trudy BGTU* [Proceedings of BSTU], 2015, issue 1, no. 1, Forestry, Nature Management, Processing of Renewable Resources, pp. 74–78 (In Russian).

## Информация об авторе

**Шахаб Вольга Васільеўна** – кандыдат педагагічных навук, дацэнт, намеснік начальніка вучэбна-метадычнага аддзела. Беларускі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт (220006, г. Мінск, вул. Свярдлова, 13а, Рэспубліка Беларусь). E-mail: shahab.olga@gmail.com

## Information about the author

**Shahab Olga Vasil’evna** − PhD (Pedagogics), Deputy Head of the Educational-Methodical Department. Belarusian State Technological University (Sverdlova str., 13a, 220006, Minsk, Republic of Belarus). E-mail: shahab.olga@gmail.com

*Поступила 15.05.2017*